

ДОБРЫ ВЕЧАР

Добрый вечер

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ ГАЗЕТА

1992 ЛІСТАПАД 4 Серада

№ 209 (394)

Цана 1 рубель

СТАЛІЧНАЯ ХРОНІКА

● ВЫСТАВКИ

Я НАРИСУЮ ВАМ СКАЗОЧНЫЙ ОСТРОВ

ОЛЬГА ПАТЫКО.

ПРЕЗЕНТАЦИЯ выставки художественного творчества «Коллекция-92», состоявшаяся в минской специализированной школе № 14 для глухонемых детей, протекала далеко не так шумно, как принято сейчас представлять. Скромный торт и от души заваренный чай, мне кажется, с успехом заменили надоевшее всем шампанское и красную икру, а съемочная группа белорусского телевидения и один корреспондент газеты — шумную толпу журналистов.

Выставленные в маленьком помещении бывшего склада 11 работ учеников школы составляют основу коллекции, с любовью собранной учителем рисования и художником Дмитрием Ремовичем Ермиловым. Около 60 остальных картин размещены в коридорах и классах.

Некоторые из ребят, чье творчество представлено здесь, — участники крупных международных выставок и даже обладатели их высших наград. Что же они рисуют! Наверное, почти то же самое, что и другие дети — сказочные острова под солнцем, ярких птиц с человеческими глазами, или просто что-нибудь для души.

● ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ

НЕ ТРЭБА БАЯЦЦА ПРАДПРЫМАЛЬНІКА

ІОСІФ ЯНУШКАЎ, «ДВ».

Менавіта гэтыя словы, калі перайначыць крыху правадыра пралетарыяту, маглі б стаць лейтматывам імпрэзы, што адбылася днямі ў офісе фірмы «Эридан». Бо маюць яны дачыненне як да кампаніі, так і ўвогуле да ўсіх людзей, што займаюцца аналагічнаю справаю. Толькі некалькі прыкладаў, якія прывёў на сустрэчы кіраўнік фірмы Аляксандр Патупа.

Незалежная выдавецка-паліграфічная кампанія «Эридан» створана ў лютым 1992 года на базе літаратурна-выдавецкага агенцтва, зарэгістраванага як самастойнае прадпрыемства ў кастрычніку 90-га. А сёння яна — адна з найбуйнейшых выдавецкіх фірм на тэрыторыі СНД. У мінулым годзе кампаніяй было выпушчана выданняў аб'ёмам прыкладна як палова Дзяржкамдруку. За час існавання «Эриданом» выданы 83 кнігі, а акрамя таго, «убачылі свет» 4 газеты і 4 часопісы. Як бачыце, за параўнальна кароткі тэрмін (а пачыналі практычна з «нуля») зроблена нямала. Сёння прадукцыя фірмы — шматтомныя серыялы Чэйза, Саймака, Говарда, Крысці, Хайнлайна, двухтомнік Бродскага, «Библия для детей», папулярная літаратура для прадпрымальнікаў — добра вядома і не патрабуе дадатковай рэкламы. Больш таго, «Эридан» займаецца сёння самымі рознымі праектамі — ад кнігавыдавецкіх да штотыднёвіка «Феміда» і ўдзелу ў стварэнні тэлепраграм, у прыватнасці на Беларускім тэлебачанні — «Рэйтынг». Дзеля гэтага наладжана супрацоўніцтва з шэрагам замежных фірм і арганізацый, у тым ліку з Англіі, Францыі, ЗША і г. д.

Аб сур'ёзнасці і аўтарытэце фірмы сведчыць і тое, што, як сцвярджае А. Патупа, яна не робіць «пірацкіх» выданняў (з аўтарамі або іх літаратурнымі агентамі заключаюцца дамоўленасці); «Эридан» не робіць таямніцы ні з паходжання сваіх капіталаў, ні з вынікаў гаспадарчай дзейнасці (яны былі асветлены ў адпаведным прэс-рэлізе); каля мільёна грошай у мінулым годзе было расходавана на дабрачынныя мэты.

Сп. Патупа выказаўся і па пытаннях мовы, калі падкрэсліў, што ім, як выдаўцам, усё роўна як друкаваць кнігу — па-руску, беларуску, французску або арабску. Крытэрый адзін — каб яна была патрэбна і чыталася людзьмі. Ён за тое, каб беларуская мова развівалася — глыбока, усебакова,— але не закранала «непад'емныя, на яго погляд, сферы» (навуку, тэхнічную, чыста дзелавую). І калі будзе заказ на беларускія падручнікі, то «Эридан», безумоўна, з задавальненнем яго выканае.

● РАЁННЫЯ ВЕСТКІ

МЯСЦОВАЯ ЎЛАДА ДУМАЕ ПА-ДЗЯРЖАЎНАМУ

АСЯ ТРАЦЮК, «ДВ».

ВЫДЗЯЛЕННЕ дадатковых сродкаў на ўтрыманне патрульна-паставой службы Першамайскага РАУС — менавіта гэтай тэме была прысвечана сесія народных дэпутатаў раёна. Вынікамі яе работы з карэспандэнтам «ДВ» падзяліўся загадчык арганізацыйнага аддзела Мікалай Паўлавіч Кіеня:

— Перш чым вынесці гэтае пытанне на разгляд народных дэпутатаў, яго прапрацавалі на пасяджэнні прэзідыума райсавета. У ходзе сесіі заслухалі начальніка Першамайскага РАУС В. С. Патаповіча аб сітуацыі ў праваахоўных органах, а таксама думку народных дэпутатаў, сярод якіх хацелася адзначыць выступленне Валерыя Грыцука.

Было прынята адзінадушнае рашэнне аб дапамозе патрульна-паставой службе раёна. Яна заключаецца ў наступным: увядзенне ў 1992 годзе дадатковых сродкаў у суме 500 тысяч рублёў на ўтрыманне ППС, а пры зацвярджэнні мясцовага бюджэту на 1993-й мяркуецца вышукаць сродкі для павелічэння гэтай службы яшчэ на 20 чалавек. Фінансаваму аддзелу сумесна з праваахоўнымі органамі раёна зрабіць неабходныя разлікі і ўнесці свае прапановы для вышукання сродкаў у тэрмін да наступнай сесіі. Яна адбудзецца ў снежні.

Як ставяцца да гэтага рашэння самі супрацоўнікі праваахоўных органаў? Гэта пытанне было адрасавана камандзіру падраздзялення патрульна-паставой службы раёна Віктару Аляксандравічу Праўдзіну:

— Прынятае сесіяй рашэнне будзе спрыяць меншай напружанасці ў нашай працы. Бо 80 чалавек, якія нясуць кругласутачную службу, недастаткова для бяспекі жыхароў раёна.

— Як работніка праваахоўных органаў, вынікі сесіі вас, зразумела, радуюць. Але вы яшчэ з'яўляецеся народным дэпутатам Першамайскага раёна...

— Сённяшняя сесія паказала, што раённая ўлада пачынае думаць і працаваць па-дзяржаўнаму і займаецца надзённымі мясцовымі клопатамі. І не чакае ўказкі зверху, як было раней. І гэта абнадзейвае.

● ДНИ ДАНИИ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ



«НОВО НОРДИКС» ИЩЕТ ПАРТНЕРОВ...

ВИКТОР СОЛОВЬЕВ, «ДВ».

В ОБЩЕСТВЕННО-ПОЛИТИЧЕСКОМ ЦЕНТРЕ ПО УЛИЦЕ ОКТЯБРЬСКОЙ ОТКРЫЛИСЬ ДНИ ДАНИИ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ. В НИХ ПРИНИМАЮТ УЧАСТИЕ МНОГИЕ ВЕДУЩИЕ ФИРМЫ ЭТОЙ СТРАНЫ.

Фирма «Ново Нордикс», как говорится, в рекламе не нуждается. Ее продукция хорошо известна во многих странах мира, она экологически чистая и безвредна для потребителей. Может быть, именно поэтому она привлекла внимание бизнесменов из нашей республики, которая еще долго будет ощущать на себе последствия чернобыльской трагедии.

— Мы с пониманием отнеслись к проведению в Беларуси Дней Дании, — говорит директор бюро отдела фирмы «Ново Нордикс» в Польше Макс Неугартен. — Постарались оформить нашу экспозицию так, чтобы она как можно полнее раскрыла возможности нашей компании в области переработки ферментов, других прогрессивных технологий. Ведь во многих странах Запада ферменты в последние годы стали применяться повсеместно в качестве добавок к кормам для бройлеров на пшеничной, пшенично-ячменной и ячменной основе.

Повышение уровня утилизации кормов при этом в типичном случае составляет 4-6 процентов в случае кормов на пшеничной основе и 10 процентов — в случае кормов на ячменной основе.

— Мне хорошо известно, что в вашей республике в этом году широко использовался для борьбы с колорадским жуком наш ларвицид «Новодор» ТМ, — продолжает Макс Неугартен. — Примечательно, что его применение безвредно для потребителя продукта и эффективно в борьбе с насекомым.

Для тех, кого заинтересовала продукция фирмы «Ново Нордикс», сообщаем ее телефон и координаты в Варшаве: телефон 64-20-540, факс 423-493 и телекс 816-003, Макс Неугартен.

Немало посетителей было и у павильона компании Ян Интернэшнл А/О, где с экологически чистыми продуктами питания как для детей, так и для взрослых посетителей знакомил заместитель заведующего продовольственным отделом Педер С. Нильсен.

— К сожалению, — говорит он, — ваши бизнесмены охотно покупают у нас пиво и шоколад. А ведь мы производим предельно чистую продукцию для детей до шестимесячного возраста. Примечательно, что молоко датских коров экологически чистое, так как они не болеют и не получают в свой рацион лекарств...

Сегодня выставка датских фирм на Октябрьской заканчивает свою работу.

На снимке Александра Толочко (Белинформ) — в павильоне фирмы «Ново Нордикс».

ІНФАРМБЮРО

КАЛЯНДАР

ВОСЕНЬ. 309 ДЗЕНЬ ГОДА.
СОНЦА ўзышло ў **7.15**, зойдзе ў **16.32**. Даўжыня дня **9.17**.
МЕСЯЦ — першая чвэрць.

ІМЯНІНЫ

СЁННЯ: Аляксандра, Канстанціна, Альгерда, Кароля.
ЗАЎТРА: Елісея, Ігната, Якава, Славаміра, Альжбеты.

НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

«Да Казанскай не зіма, пасля Казанскай — не восень».

Калі ў дзень святкавання іконы Казанскай Божай Маці пойдзе дождж — хутка зіма. У гэты дзень не выбіраліся ў далёкі шлях.

ЯК ПАВЕДАМІЎ ГІДРАМЕТЦЭНТР

СЁННЯ ў 11 гадзін у Мінску было 6 градусаў цяпла. Ціск 738 мм ртутнага слупа. Адносная вільготнасць 90 працэнтаў. Вецер паўднёва-заходні — 4 м/сек.

ЗАЎТРА ў Мінску чакаецца воблачнае, з праясненнямі надвор'е, днём кароткачасовыя ападкі. Тэмпература паветра ноччу — 1—3, днём — 3—5 градусаў цяпла.

КЛИНТОН — ПРЕЗИДЕНТ?

По предварительным оценкам, на выборах президента США с явным преимуществом лидирует Билл Клинтон (Демократическая партия). Судя по всему, он и сменит Джорджа Буша. На выборах в Конгресс также впереди кандидаты демократов.

● ТОРГИ

НА ФОНДОВОЙ БИРЖЕ — ШТИЛЬ


З. АЛЕНСКИЙ.

ВЧЕРА, 3 ноября состоялись очередные торги на Белорусской фондовой бирже. Была заключена только 1 сделка: продано 10 простых и одна привилегированная акция АО «Элтик». Низкая активность фондовой биржи говорит о том, что процесс приватизации в республике практически не начался. На торгах было выставлено только 9 видов акций. Однако для инвесторов представляло интерес только АО «Элтик» — компания, связанная с производством.

● ПРАЗДНИКИ

«ПОЛЕ ФЕРМЕРА» С ВИДАМИ НА УРОЖАЙ

ВИКТОР ДЯТЛИКОВИЧ, БелаПАН.
Фото ВИКТОРА СТАВЕРА.



В НАШЕЙ республике фермеров еще совсем немного, можно сказать, даже очень мало. Но и этим немногим не хватает техники, специальных знаний, нет связи друг с другом. Для того, чтобы хоть в какой-то мере решить эти проблемы, 1 ноября во Дворце культуры минского автозавода состоялся организованный Крестьянским союзом Беларуси праздник «Поле фермера».

Вниманию фермеров и всех пришедших на праздник на выставке-продаже предлагалась разнообразная техника — мотоблоки, прицепы, косилки, минитракторы и т. д. — все то, что так необходимо в любом хозяйстве. Белорусский республиканский учебный центр проводил запись на трехмесячные фермерские курсы. Всем интересующимся давались консультации по любым вопросам. Те, кто собирается построить дом, могли ознакомиться с проектами индивидуальных коттеджей, разработанными республиканским проектно-изыскательным институтом «Белсельстройпроект».

Не забыли организаторы праздника и про горожан — для них была устроена продажа овощей, фруктов, мяса, произведенных фермерами, работал буфет. На протяжении всего праздника на площади перед Дворцом культуры выступали коллективы художественной самодеятельности.

● ЮБИЛЕЙ

ГОДОВАЛЫЙ, НО УЖЕ ЗРЕЛЫЙ...

АНАТОЛИЙ БЕЛОУС, корреспондент «ДВ».

Приятное событие предстоит отметить нашим коллегам из информационного агентства «Белапан» 19 ноября — годовщину своего основания. Дата эта вдвойне знаменательна, ибо уже с полным основанием можно констатировать, что агентство состоялось. Начиная со скупых, порой одиозных и противоречивых информаций, этот творческий коллектив стал регулярным поставщиком злободневных и довольно объективных материалов во многие издания. В их числе все крупнейшие республиканские газеты, наш «Добры вечар», «Белорусский рынок» и «Вечерний Минск». Суммарный тираж изданий, публикующих материалы агентства, более двух миллионов экземпляров. Его информацию уже можно услышать в программе российского телевидения «Вести» и радиопрограмме «Маяк». Не брезгуют белапановской продукцией и местные радио и телевидение. Тесный контакт установлен агентством и с белорусской службой радио «Свобода», расположенной в Мюнхене. Налаживается сотрудничество с коммерческим каналом городского телевещания. На днях здесь уже вышла первая информационная передача. Ее регулярность пока невелика — раз в неделю, но в перспективе предполагается ежедневное освещение текущих событий столицы и республики. Примечательно и то, что до сих пор ни одно из вышеперечисленных изданий и программ радио и телевидения не расторгли рабочих контрактов с агентством...

— Принципиально важен тот факт, что мы являемся независимой организацией, — подчеркивает редактор одного из отделов Виктор Федорович. — Нет у нас спонсоров, не имеем мы никакого отношения и к государственным структурам. Работаем на полной самоокупаемости. И, увы, проблем материально-технического плана еще достает. Коллектив трудится практически в одном помещении, на одном телефоне. И, между тем, от взятых обязательств не отказываемся. Ежемесячно наши заказчики получают более двухсот печатных страниц информации. У истоков создания нашего агентства стоял наш директор Александр Липай. Кстати, личность творческая, активно работающий журналист, прошедший школу газеты «Знамя юности». В настоящий момент он освещает ход работы нынешней сессии Верховного Совета республики. Из плодотворно пишущей братии выделю Марата Врублевского, Елену Анкудо, Ирину Ноздрину, Мирославу Сульдину, Ирину Левшину. А в сущности коллектив у нас очень молодой и потому мы смело смотрим в будущее. И, видимо, количество работников как штатных, так и по контракту — не показатель. Этому числу мы предпочитаем умение и профессионализм, оперативность и содержательность. Вот еще бы корреспондентскую сеть расширить по республике. А в остальном — пусть судит наш читатель.

● ФАКТ

С ЛЮБОВЬЮ И ЗАБОТОЙ ДАН ИЗ ДАНИИ

АЛЕКСАНДР МОЛЧАНОВ, БЕЛАПАН.

В МИНСКЕ находятся Элен и Дан Диссинг-Мадсены — представители общественного фонда «Друзья Дана», который имеет давние дружеские и деловые отношения с Белорусским детским фондом.

Год назад датчане приняли к себе на оздоровление свыше 200 белорусских девчонок и мальчишек. Нынешний их визит в Минск — второй в этом году. Его цель — передать очередной груз гуманитарной помощи: детское питание, одежду, медикаменты. Гости ознакомились с работой онкологического центра в Боровлянах, встретились с воспитанниками детского дома, совершили поездки в Мозырь и Барановичи.

За помощь, оказанную нашим детям, датский фонд удостоен почетной грамоты «Признание» Белорусского детского фонда. Их заслуги также отмечены Министерством образования республики, где 29 октября им вручена грамота народного образования.

● СИТУАЦИЯ

ДВА РАЗА «АЛЛО» = ОДИН РАЗ «НЯМ-НЯМ»

РИД.

В НЕКОТОРЫХ комиссионных киосках Минска вдруг катастрофически упали цены на жевательные резинки. Всего 30 копеек стоят популярные среди детворы жвачки «Турбо» и «Суперстар».

Однако понятно, что коммерсанты не будут продавать товар себе в убыток. Весь секрет в том, что продают они не просто за тридцать копеек, а за две телефонные «пятнашки». Причем, сбывают явно залежалый товар.

● РЭХА ПАДЗЕІ

ДАРОГАЙ ПАМЯЦІ, ЖАЛЬБЫ...

ФОТА В. СТАВЕРА.

КУРАПАТЫ. ЯКОМУ БЕЛАРУСУ НЕ ЗНАЁМА ГЭТА НАЗВА! ТУТ, НА ЎСКРАІНЕ МІНСКА, ЗНАЙШЛІ АПОШНЯЕ ПРЫСТАНІШЧА ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ ЛЮДЗЕЙ, ЗАГІНУЎШЫХ АД РУК СТАЛІНСКІХ КАТАЎ У 1937—41 ГАДАХ.

У ЛЮБУЮ ПОРУ ГОДА НЕ ЗАРАСТАЕ СЮДЫ ЛЮДСКАЯ СЦЯЖЫНА. ВОСЬ І Ў ПАНЯДЗЕЛАК, У ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ НАШЫХ ПРОДКАЎ — ДЗЯДЫ, ТЫСЯЧЫ МІНЧАН, ЖЫХАРОЎ ІНШЫХ МЯСЦОВАСЦЯЎ БЕЛАРУСІ, ГАСЦЕЙ НАШАЙ СТАЛІЦЫ ПРЫЙШЛІ Ў КУРАПАТЫ, КАБ МІНУТАЙ МАЎЧАННЯ ЎШАНАВАЦЬ ПАМЯЦЬ АХВЯР СТАЛІНСКІХ РЭПРЭСІЙ.

КЛАДУЦЦА ДА ПАДНОЖЖА ПАМЯТНАГА КАМЕННЯ КВЕТКІ, МІЛЬГАЦЯЦЬ АГЕНЬЧЫКІ СВЕЧАК. ПЛЫВЕ НАД МАГІЛАЙ ПАМІНАЛЬНАЯ МАЛІТВА. СПІЦЕ СПАКОЙНА, ЖЫВЫЯ ВАС НЕ ЗАБУДУЦЬ.









ПОСТОЯННО ДЕЙСТВУЮЩАЯ ВЫСТАВКА

РИД.

В ВЫСТАВОЧНОМ зале Союза художников Беларуси открылась постоянно действующая выставка произведений белорусских художников. Демонстрируются сотни работ различного жанра — живопись, графика, изделия народных мастеров.

Представлены произведения ветерана В. П. Кульвановского, молодых художников Игоря и Елены Бархатковых, Александра Лубневского, других авторов.

На выставке можно купить или заказать произведение, получить консультацию специалистов. Вход свободный.

● МНЕНИЕ

КАК ЗАЩИТИТЬ БЕЛАРУСЬ?

ВОЕННАЯ ДОКТРИНА С ТОЧКИ ЗРЕНИЯ ЛИБЕРАЛА

ВЛАДИМИР ГРИНЕВИЧ, майор, член Совета ОДПБ.

В повестку дня очередной сессии Верховного Совета Республики Беларусь включен целый ряд военных вопросов, в том числе и «О военной доктрине». Наша партия уже давно занимается этой проблемой с позиций либерализма, а потому представляется возможным поделиться своими соображениями.

В НЫНЕШНЕЙ ситуации отчетливо просматривается два подхода к проблемам военного строительства. Представители БНФ, других сил этой же ориентации, ругают на чем свет стоит политику правительства. Военную угрозу, судя по всему, они видят со стороны России.

Правительство же тем временем разработало целый пакет военных законов. И один из основных — Закон о всеобщей воинской обязанности. Если его придется выполнять, то наша республика еще долго будет оставаться самым милитаризованным государством в Европе. И в европейском доме нас в таком случае вряд ли пустят.

1. ПРЕДПОСЫЛКИ НОВОГО МИРОПОРЯДКА

НА ВОПРОС стоит серьезный: с кем, какими силами и как может воевать белорусское войско? В каждом государстве на подобный вопрос устами верховной власти отвечает военная доктрина. Обычно она имеет две стороны: политическую и военно-техническую.

Наша власть пока что решилась высказать пожелание видеть независимую Беларусь как нейтральное и безъядерное государство. И вдруг надолго замолчала, как бы испугавшись сказанного.

Хотя чего тут пугаться? Мы видим, как развертывается строительство нового миропорядка на основе добровольного и именно с позиций доброй воли отказа государств мирового сообщества от военных блоков и противостояния.

И уже созданы все необходимые объективные предпосылки для его организации. Прежде всего это — многоэтапная и достаточно эффективная миротворческая деятельность Организации Объединенных Наций. Во-вторых, можно констатировать отсутствие противостояния военных блоков. Оставшийся в одиночестве военный институт НАТО вследствие распада ОВД обречен на радикальное сокращение и создание на его основе вооруженных сил ООН. Такая тенденция отчетливо просматривается: создан Североатлантический Совет по сотрудничеству, куда вошли 16 стран НАТО, 5 восточноевропейских и 3 прибалтийских государства, а также 11 республик бывшего СССР. Отсутствует теперь и объективная причина для раскола мирового сообщества на военные блоки вследствие отхода стран бывшего соцлагеря от коммунистической идеологии. Что касается стратегии «ядерного устрашения» блока НАТО, то она исторически доказала свою жизненность и необходимость, будучи взятой за основу деятельности ООН, способна служить делу мира и стабильности до полного уничтожения ядерного оружия. Вошедший в историю прецедент использования сил для обуздания агрессора в ходе преодоления кризиса в Персидском заливе в 1991 году позволяет всем независимым государствам оценить способность ООН объективно определить агрессора и своевременно принять необходимые и адекватные с тем строго ограниченные мирные и достаточные меры силового воздействия.

2. ПОЛИТИКА СОТРУДНИЧЕСТВА

ПРИНИМАЯ во внимание трудности экономической реформы, основным принципом политической строительства военной доктрины Беларуси может быть сокращение вооруженных сил и вывод войск и оружия СНГ с ее территории. Процесс вывода ожидается достаточно длительным по времени, и принцип приобретает характер долговременной политической программы.

Другим основополагающим принципом политики сотрудничества может стать военное сотрудничество с соседями — Россией, Украиной, Польшей, Литвой и Латвией. Особо актуален вопрос военного сотрудничества с Польшей, которое может стать примером и подтверждения уровня, сравнимого с уровнем сотрудничества с бывшими республиками СССР. Для страны совершенно ненужной подозрительности оно должно носить предельно открытый характер.

Новым (как с точки зрения практики, так и в смысле психологического восприятия), но органично вписывающимся в общую политику сотрудничества может стать военное сотрудничество с ООН. В соответствии с ним Республика Беларусь в обмен на гарантии международного сообщества о всемерной помощи в случае вооруженной агрессии против нее предоставляет свои вооруженные силы в распоряжение ООН для использования в целях предотвращения конфликтов и обуздания агрессоров.

Этот принцип позволяет избежать военного противоборства, характерного для военной доктрины бывшего СССР. Ведь, заявляя о строго оборонительной направленности своей военной доктрины, ее разработчики с целью недопущения действия оборонительного характера подготовки вооруженных сил вынуждены были вводить в описание военно-технической стороны такой элемент, как проведение наступательных операций с целью нанесения решительного поражения возможному агрессору. А это без вторжения на чужую территорию невозможно. Само собой, этим мы давали основания другим странам подозревать себя в скрываемой агрессивности.

Объявление об участии в акциях ООН дает возможность осуществления комплексной всесторонней подготовки вооруженных сил как в оборонительном, так и в наступательном аспектах, не вызывая ни у кого подозрения в агрессивных намерениях.

3. ДВЕ КОНЦЕПЦИИ ВОЕННОЙ СТРАТЕГИИ

СЕГОДНЯ говорить о непосредственной военной угрозе Беларуси как независимому государству нет оснований. Основное предназначение вооруженных сил — обеспечить условия для мирной жизни и созидательной деятельности его народа. Достигается это реализацией концепции единых вооруженных сил ООН, когда мир и стабильность для народа Беларуси обеспечиваются военной мощью всего мирового сообщества за вполне допустимую плату в виде долевого участия в военных программах ООН.

Республика Беларусь уже в ближайшее время могла бы выступить с инициативой (возможно, совместно с соседями) об организации вооруженных сил ООН.

Вопрос определения вероятных противников и союзников в возможной войне может решаться соответствующими структурами ООН и Республики Беларусь отдельно в каждом конкретном случае.

Состав Вооруженных Сил Беларуси, а также требования к их подготовке и способам применения согласуются с ООН, исходя из экономических возможностей республики и ее места и роли в военных структурах ООН.

Совершенно очевидно, что из двух возможных случаев применения вооруженных сил республики — на своей территории и за ее пределами — наиболее вероятным представляется последний. Это обстоятельство вызывает необходимость высокой мобильности вооруженных сил.

До заключения соглашения о единых силах Объединенных Наций все вопросы о белорусской армии могут решаться с учетом провозглашенных принципов безъядерного и нейтрального статуса республики.

В результате сокращения войск Беларусь будет располагать армией, которую можно представить в виде двух составляющих: войска, предназначенные для использования на земле, и войска, решающие свои задачи над поверхностью земли. Они могли бы состоять из двух видов вооруженных сил с раздельным командованием под общим руководством военного министра.

Подготовка вооруженных сил по этой концепции предусматривает способность к быстрой переброске войск и грузов с целью создания группировок на театре военных действий, при этом особое внимание уделяется боеготовности «сил быстрого развертывания», увеличению возможностей и повышению готовности сил и средств воздушных перебросок.

ВРЕМЯ НЕ ТЕРПИТ

МАРИНА ГУЛЯЕВА.

Венгринович Валерий Львович, доктор технических наук, и его лаборатория вычислительной диагностики Института прикладной физики АН Беларуси два года назад были в числе инициаторов введения на Беларуси системы электронного денежного обращения. Но только в 1992 г. программа приняла статус государственной. Ее реализация поручалась ряду крупнейших белорусских НИИ и заводов, таких, как БелНПОВТ, АН РБ, «Интеграл», НПО «Планар» и др. Бюджетные инвестиции поручалось сделать Минфину РБ в размере не более 3 процентов от общей стоимости программы, но последний отказался выделить и эту сумму. Таким образом, осуществление намеченного отложилось по этой причине на неопределенный срок. Альтернативы системы электронных платежей для Беларуси в общем, как считает В. Л. Венгринович, нет. Почему! И что может быть следствием задержки начала работ! Мнение В. Л. ВЕНГРИНОВИЧА:

— Электронная банковская система и ее программное обеспечение решают такие задачи, как автоматизация наличного денежного обращения, защита товарного рынка, ускорение межбанковских и межгосударственных расчетов, обеспечение частичной валютной конвертации и т. д. Каждая задача определяется конкретной экономической ситуацией и приоритетными потребностями экономики. Если два года назад основную цель введения системы электронного денежного обращения можно было определить, как защиту товарного рынка, то сегодня, на мой взгляд, электронные деньги прежде всего будут способствовать плавному переходу к собственной валюте путем частичной конвертации. Это то новое, что может предоставить электронная система при недостатке стабилизационного фонда и валютных гарантов, что так характерно для Беларуси.

Второе, электронные деньги позволят поднять уровень банковской системы, уровень расчетов до современного. И потом, это — необычайно прибыльное дело. Когда, к примеру, на перевод денег надо потратить не недели, за которые предприятие становится банкротом, а 20—30 секунд, то выгода несомненна.

Однако не так давно появились предложения не создавать свою систему, а приобрести готовую, сделанную на Западе. Анализ показывает, что это обойдется намного дороже как при обращении, так и при эксплуатации. Тем более, если учесть специфичность задач Беларуси, которые не рассчитаны на готовые программы. Важным аргументом является и то, что у нас есть свой коллектив названных предприятий и банков, которые уже два года занимаются проектом. Сделано достаточно много, что даст возможность свести к минимуму дальнейшие затраты. Но из-за финансовых проволочек работы продвигаются медленно. А ситуация в Беларуси постоянно изменяется, и потому, я считаю, что всякая задержка, а она и так составляет два года, может привести только к снижению эффективности программы.

● ЭКАНОМІКА І ЎЛАДА

ВАУЧЭР—ЁН І НА БЕЛАРУСІ ВАУЧЭР

АД ПЕРАМЕНЫ ГАСПАДАРОЎ УЛАДЫ НЕ ПРЫБАЎЛЯЕЦЦА

МІХАІЛ ВАЛЬКОЎСКІ.

КАМУНІЗМ пачынаўся з таго, што ўласнасць адабралі ў прыватных асоб і аддалі ўсім. Зварот да капіталізму пачнецца з супрацьлеглага працэсу —уласнасць адбяруць ва ўсіх і аддадуць кожнаму. А ці была гэта ўласнасць калі-небудзь у валоданні ўсіх і кожнага? Пакуль тэарэтыкі спрачаюцца, практыкі гэтую ўласнасць прыхопліваюць, хто колькі можа, каму колькі пасада і сувязі дазваляюць. З балансу на баланс і па спрошчанай схеме—па астаткаваму кошту. Удзел у гэтай гульні бяруць даволі вузкія колы грамадзян. Зараз дэманструецца жаданне кола пашырыць—рыхтуецца раздача прыватызацыйных чэкаў.

Паспрабаваўшы паскорыцца, паспытаўшы перабудовы, праз незлічоныя мадэлі гасразліку, суверэнныя мытні і альтэрнатыўную эканоміку падышлі нарэшце да прыватызацыі. Яна, толькі яна адна, здольна выратаваць нашу эканоміку і бацькоў айчыннай дэмакратыі. Зноў эканамічныя метады апранаюць у ідэалагічнае адзенне. Зараз пра прыватызацыю шмат пішуць расійскія сродкі масавай інфармацыі, бо там яна пачалася і сяк-так ідзе. У беларускіх—адносная цішыня: зробіць Расія, а мы паўторым. Як ужо неаднойчы было.

А што атрымаем у выніку гэтага мерапрыемства? У тэорыі ўсё ясна і дакладна: з'явіцца клас уласнікаў, прыватны інтарэс дасць магутны штуршок развіццю эканомікі, пачнуць працаваць рынкавыя законы, каэфіцыент карыснага дзеяння эканомікі ўзрасце, настане ўсеагульнае працвітанне. Але найлепшыя тэорыі ў нашых умовах даюць часам такі нечаканы вынік, такія пабочныя эфекты...

Чаго чакаць ад нашай прыватызацыі? Якія конікі здольна выкінуць яна? Па-першае, неабходна адзначыць прымусовы характар яе. Згоды на тое, каб я стаў уласнікам часткі дзяржуласнасці, ніхто ў мяне не пытаў. «Мужык—ты, частником будешь, слышишь, мужик, крутись!» (Як на канцэрце вядомага сатырыка). Толькі хто ж адкажацца ад яе, калі даюць, проста навязваюць і не трэба ўпотайкі выносіць гэту уласнасць з рабочага месца. Зноў нас робяць аб'ектамі буйнамаштабнага сацыяльнага эксперымента, ў чарговы раз абяцаюць залатыя горы. Але яшчэ не было ў нас, каб ад эканамічных пачынанняў дзяржавы выйграваў увесь народ, а не частка яго...

Па-другое, не вельмі ясна, якая надзейнасць і ліквіднасць гэтых каштоўных папер — прыватызацыйных чэкаў. Пакуль агульная тэндэнцыя, што «каштоўныя» паперы нашай дзяржавы хутка становяцца звычайнай паперай: мэтавыя аблігацыі, візітныя карткі пакупнікоў, аднаразовыя купоны. Ці не такі лёс чакае прыватызацыйныя чэкі?

Па-трэцяе, памеры часткі ўласнасці, якая прыйдзецца кожнаму з нас. У грашовым выражэнні—гэта хутчэй усяго будзе некалькі тысяч цаглін, нават не ўкладзеных у сцяну. Згадзіцеся, што з такой сумай падмурак уласнай справы не пабудуеш. Ды і дабрабыт на дывідэнды ад акцый, набытых за прыватызацыйны чэк, наўрад ці палепшыш. Акцыі на 50 000 рублёў пры гадавых дывідэндах у 10 працэнтаў (і тое добра, прыватызавацца будуць не самыя лепшыя прадпрыемствы) дадуць вам 5000 рублёў. Скасуйце падаткі. Што застанецца? Стаць уласнікам цырульні, крамы ці рэстарана? Не варта і марыць. Гэта маёмасць ужо падзелена, і на яе недастаткова чэкаў усёй вашай радні. Хіба што іх хопіць на будачку чысцільшчыка абутку недзе за кальцавой дарогай...

Нарэшце—прынцып сацыяльнай справядлівасці, пакладзены ў аснову прыватызацыі. Няўжо дзяржава ўсім запазычыла прыкладна аднолькава? Не, аднолькавых стартавых умоў для рыўка ў светлае капіталістычнае заўтра прыватызацыйныя чэкі не створаць. Прыватызацыйны чэк—гэта проста суцяшальны прыз безнадзейна адстаўшым, дымавая заслона, якая назаўсёды схавае першыя этапы прыватызацыі, на якіх і стварыліся сапраўдныя багатыя. Мне здаецца, Карл Маркс спаліў бы свой славуты «Капітал», калі б толькі даведаўся, як у краіне развітога сацыялізму нашчадкі яго ідэй робяць капіталы.

Акрамя чыста псіхалагічных момантаў (усеагульная роўнасць у беднасці, падазронасць да багацця, эканамічная непісьменнасць насельніцтва) неабходна адзначыць: прыватызацыйныя чэкі, зярняткі капіталізму, упадуць на высушаную сацыялізмам эканамічную глебу. Няма ў дастатковай колькасці структур і механізмаў, здольных трансфарміраваць чэкі ў акцыі, забяспечыць іх эфектыўнае ўздзеянне на стан спраў на прадпрыемстве, пераліванне капіталаў з галіны ў галіну, забяспечваць структурную перабудову эканомікі.

Удалых прыкладаў прыватызацыі можна прывесці няшмат. Але не трэба забывацца, што механізм, маштаб, хуткасць прыватызацыі і для розных краін зусім розныя. Гэты працэс ішоў ва ўмовах, якія істотна адрозніваліся ад сённяшніх умоў на Беларусі. Адзінае, што аб'ядноўвае прыватызацыю ў замежных краінах—яе добрая падрыхтаванасць, дробязі, дэталі, якія прыносілі плён, вялікая растлумачальная праца сярод насельніцтва.

На Захадзе, куды зараз з хрустам шыйных пазванкоў усе павярнулі галовы, існуе побач шмат форм уласнасці. Так, апякаюць малы і сярэдні бізнес. Але галоўная падтрымка (ільготнымі крэдытамі, падаткамі, мытнай палітыкай)—прыярытэтным галінам эканомікі, а не формам уласнасці.

Прыватызацыя—гэта не мэта, а спосаб яе дасягнення. Мэта—будаўніцтва эфектыўнай эканомікі. Лібералізацыя цэн навучыла — сам па сабе асобны з метадаў, звенняў рэформы ўсіх рэформ не заменіць. Перадача такарнага станка сярэдзіны века ў прыватныя рукі не палепшыць яго тэхнічных характарыстык. Змена формы ўласнасці (пакуль толькі ў тэорыі) створыць перадумовы для тэхнічнага пераўзбраення, для росту эфектыўнасці.

Прыватызацыя на Захадзе—апошняя мера, калі ўжо ўсе намаганні не прынеслі жаданых вынікаў. Тым самым дзяржава распісваецца ў бяссіллі, у няздольнасці чыноўнікаў стварыць спрыяльныя ўмовы і эфектыўна кіраваць маёмасцю. Але чаму не пачаць з аздараўлення крэдытна-фінансавай сістэмы? Не знізіць дэфіцыт бюджэту, не зменшыць траты на ўтрыманне дзяржапарата, не замарозіць зарплату, не перагледзець сацыяльныя праграмы? Не, у нас ўсе наадварот. Дзяржапарат расце. Ніводзін кабінет у райкамах, абкамах, ЦК не застаўся без новага гаспадара. «Чайкі» і «Волгі» таксама не прастойваюць без справы—чыноўных пасажыраў хапае. Каб купіць аўтобус ці трамвай, у казне няма валюты. А на «вольвы» і «мерседэсы» для чыноўнікаў знаходзіцца. Амбіцыйнасці нашых сацыяльных праграм могуць пазайздросціць багатыя Швецыя і ЗША. Армія краіны, дэкларавайшай нейтралітэт, можа пусціць гэту краіну з жабрацкай торбай па свеце. Справа не толькі ў тым, што да зорачак генералаў і афіцэраў патрэбны адпаведныя аклады і кватэры. Ды вельмі дарагія ўзбраенні, каб было ім чым камандаваць. Шаноўныя, гэта не антыармейская істэрыя. Дзяржаўны інстытут—армія—патрабуе да сябе адпаведнай увагі. Толькі памеры, на якія яна зараз прэтэндуе, значна большыя, чым магчымасці дзяржавы.

...Не зрабіўшы значных намаганняў у тэрапеўтычным лячэнні хворай эканомікі, мы адразу пераходзім да хірургічных метадаў, да вельмі складанай і досыць хваравітай аперацыі. Ці выжыве хворая краіна пасля яе?

Але хто і якія намаганні можа прапанаваць узамен прыватызацыі? Зноў жа няма альтэрнатывы. Гэта насцярожвае.

● РЭХА ПАДЗЕЙ



▲ МІНСК. ПЛОШЧА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ. ІДЗЕ СЕСІЯ...

Фота ЮРЫЯ ЗАХАРАВА.

● РЕПЛИКА

ВСЕДОЗВОЛЕННОСТЬ ИЛИ СВОБОДА?

ИРИНА ГЕРМАНОВИЧ («ДВ»).

ИСТОРИЯ, случившаяся недавно в институте «Агат», очень характерна для нашего времени, для всех нас. Характерна и поучительна.

Дело не столько в самом институте, сколько в его гостинице. Представьте себе следующую ситуацию. У вас есть дача. Неважно, роскошный особняк или небольшой домишко. Главное — дача является вашей собственностью, она вам нужна, ибо плюс ко всему она и подкармливает. Дабы получить еще кое-какой доход, вы решаете пустить туда квартирантов. Жизнь продолжается... Вы по выходным приезжаете на дачу отдохнуть, откушать прямо с грядок свежих овощей и прочее. Квартиранты, милые люди, благодарны вам за жилье, за разрешение пользоваться не только домиком, но и садиком, и огородиком, и тем, что там произрастает. И все бы ничего, если бы не это «сладкое» слово свобода. Свобода, которую мы зачастую понимаем как вседозволенность, безнаказанность, а иногда и беззаконие по принципу: что хочу, то и ворочу.

Так вот, ваши милые квартиранты, страждущие свободы любой ценой, пишут заявление с уведомлением в садовое товарищество о том, что собравшись и посоветовавшись, приняли единодушное решение: хотим, мол, самостоятельности и посему рвем всяческие связи и контакты с хозяевами дачи. То есть с вами, захватив при этом уже в свою собственность ваши дом, сад, огород и собаку с будкой. Садовое товарищество по абсолютно понятным причинам оставило это «заявление» без ответа.

Вот такая история в образах. В нашем случае хозяином является коллектив НИИ «Агат», а квартирантами выступают работники одноименной гостиницы, которые показали типичный пример не только незнания законов, но и нежелание считаться с интересами сотрудников института, то бишь хозяина. Гостиница строилась за счет средств НИИ и в конце концов является собственностью его коллектива. Земля, на которой она расположена, выделена институту, а не коллективу гостиницы. Словом, сплошные вопросы, ответ на которые может быть один — противозаконно.

В принципе коллектив гостиницы может стать самостоятельным. Но это вправе решать только совет института. И никто более. Поэтому вполне понятно возмущение директора НИИ и совета института по поводу присвоения этого права. Масла в огонь подливает и наш брат-журналист. Не разобравшись в ситуации, не поговорив с директором института, корреспондент «Народной газеты» пишет обличительный материал «Бунт в отеле?!» под рубрикой «Крутые нравы», где директор — тиран и агрессор—не дает свободы свободолюбивому коллективу отеля. Если директор гостиницы не удосужился ознакомиться с законодательными документами, то журналисту это непростительно. Хотя мы и живем в «крутое» время, но законы все-таки надо чтить. А нравы чаще всего и становятся «крутыми» в периоды беззакония и беспредела. Если не верите, спросите об этом у сотрудников института «Агат»...

● ЗАРУБЕЖНАЯ БелаПАНорама

*** ПО СВЕДЕНИЯМ, полученным из достоверных источников, мэр Москвы Юрий Лужков заключил с правительством Азербайджана соглашение на поставку в Москву овощей, фруктов, хлопка, вина и других товаров. Москва, в свою очередь, передаст Азербайджану грузовые автомобили, строительные материалы и автокраны.**

*** МЭР МОСКВЫ Юрий Лужков издал распоряжение «О дополнительных мерах по социальной защите медработников». На основании этого распоряжения, работникам скорой медицинской помощи дотации на питание будут повышены до 100 рублей в сутки.**

*** В ГУВД Санкт-Петербурга создано новое структурное подразделение — отряд милиции численностью в 120 человек. Основная задача нового отряда — охрана культурно-зрелищных и спортивных мероприятий.**

*** ПРАВИТЕЛЬСТВО Приднестровья объявило о повышении с 1 ноября цен на ряд продуктов питания: сахар, растительное масло, хлеб и другие. Предусмотрена компенсация: на детей — 50 рублей в месяц, на пенсионеров, инвалидов и малообеспеченных граждан — 100 рублей.**

● ОБЪЕДИНЕНИЮ «ОХРАНА»—45 ЛЕТ

ПО ГОРЯЧИМ СЛЕДАМ

Текст и фото АНАТОЛИЯ ДРОЗДОВА.

РАНЬШЕ ее называли вневедомственной. Нынче это—новое солидное объединение «Охрана» при МВД Беларуси, которое стережет покой людей и сохранность личного и общественного имущества. Основная тяжесть работы у них в ночное время.

В управлении объединения лучшим мне назвали отдел при Первомайском РОВД столицы, которым командует подполковник **Дмитрий БОНДАРЕВСКИЙ.** Только в этом году с уголовным розыском раскрыто 34 преступления, пресечено 2444 административных правонарушения. 1705 квартир находятся под их присмотром. Из десяти воры пытались вынести вещи, но ни одному преступнику не удалось избежать наказания.

Вот лишь несколько примеров работы лучшей группы задержания, которую возглавляет **старший сержант Иван ОСИПОВИЧ.** Пришел он в «Охрану» по направлению трудового коллектива медремзавода пять лет назад. Чуть позже пришло пополнение —сержанты **Александр КРАСОВСКИЙ** со служебной собакой Акбаром, **Дмитрий КОХНЕНКО** и **Сергей КУЧИЦ.**

...Магазин № 12 по ул. Калиновского покупатели называют «лосиным» (несколько лет назад в торговый зал забежал заблудившийся лось). Недавно пример лося повторил Петр. Он в три часа ночи разбил стекло окна винно-водочного отдела и пытался вынести ящик спиртного. Не удалось. Милиционеры из группы Осиповича тут же его скрутили.

Не дали они и поиздеваться хулиганам над водителем «Москвича» на проспекте Ф. Скорины, у кинотеатра «Октябрь». Наглецы, взявшись за руки, перегородили дорогу, заставили машину остановиться. Избив водителя, отобрали ключи. Но тут же были пойманы и доставлены в дежурную часть. Хулиганами оказались абитуриенты политехнической академии. А в четыре часа ночи позвонил сторож из парка им. Челюскинцев: в радиорубке сработала сигнализация. Подъехав, наряд задержал бывшего «зека», тот монтировкой уже успел взломать четыре двери.



За время службы на счету ребят десятки раскрытых по горячим следам преступлений, сотни задержаний правонарушителей, мелких хулиганов.

Сейчас, сказали мне стражи порядка, у них особая тревога: массовые угоны и разукомплектование «Жигулей» первой модели, так как на нее прекращен выпуск запчастей, а на черном рынке на них подскочили цены. Не было еще ночи, чтобы в районе улиц Волгоградской и Я. Коласа не спугнули грабителей...

НА СНИМКЕ: на дежурстве группа задержания старшего сержанта Ивана ОСИПОВИЧА.

СПАДАРЫНЯ

● ФАНТАЗЁРКА

ВАЛЁНКІ ДЛЯ МАЛЫХ

Вось-вось прыйдуць сапраўдныя халады, а бацькам, вядома ж, клопат. Малыя бегаюць па падлозе і таго глядзі, хваробу падхопяць—нягледзячы на ўсё магчымыя ўцяпленні, скразнякі ўсё роўна ходзяць унізе кватэры. Да таго ж, вядома, малыя любяць гуляць на падлозе, ды гэтак, бывае, заахвоцяцца, што пазгубляюць нават і тапкі. Не паспееш агледзецца, а малое амаль што і босае. Што рабіць! Паспрабуйце пашыць яму хатнія валёнкі—і цёпла будзе, і не скіне іх малы так лёгка. Для гэтых мэт падыйдзе што-небудзь зусім нават ужо і не патрэбнае. Напрыклад, кавалачкі старога сукна—з паліто. Альбо можна выкарыстаць старую куртку. Карацей кажучы, падыйдзе любы матэрыял. Толькі мяркуйце сабе, калі тканіна тоўстая, відаць, пракладка паміж слаямі і не спатрэбіцца. А калі, напрыклад, маеце плашчоўку, дык тады, каб валёнкі былі не гэткія мяккія і трымаліся добра на назе, трэба рабіць іх з пракладкаю.

Такім чынам, прыгатуйце ўсё для працы. Вам спатрэбяцца: кавалкі тканіны, трохі ваціну, альбо сінтэтычнай ваткі. Будзе таксама добра, калі падэшву вы ўмацуеце скурай—ці то са старых зношаных сапог, ці са старой сумкі. Мабыць, не залішняй будзе і дэкаратыўная тасьма.

Цяпер прыступім да справы. Каб было прасцей зрабіць выкрайку, вазьміце цёплыя дзіцячыя шкарпэткі. Пакладзіце на бумагу і абвядзіце контур карандашом. Каб былі валёнкі прасторныя, дык, вядома ж, трэба дадаць нейкі прыпуск па ўсяму перыметру. Такіх загатовак трэба дзве на кожны валёнак.

Злажыце разам верхнія часткі валёнак з пракладкамі і састрачыце на машынцы. Тут магчымы розныя варыянты: строчку рабіць у палоску (папярок ці ўздоўж), у клетку, у ромбікі і г.д. Цяпер злажыце дзве паловы валёнка правымі старонкамі і састрачыце па заднім шве. Шво распраўце на абедзве старонкі, ды прыпарце прасам. А каб было мягчэй, дык уручную прышыйце яго іголкаю па краях, каб канцы не адгіналіся. Вось цяпер добра. Можна для моцы ўмацаваць пятку кавалачкам скуры. Яго трэба выкраіць паўкругам (ды можна таксама на ім зрабіць вышыўку — маленькія кветачкі, ягадкі і г. д.), а потым настрачыць паверсе. Цяпер засталося прастрачыць выраб спераду і панізе. Таксама выпраўце швы і прышыйце іх па баках. Швы трэба пагладзіць прасам. Пашыйце асобна «шкарпэтку» з пракладкі. А каб яна не коўзалася, прастрачыце яе па заднім шве. Валёнкі амаль што і гатовы. Цяпер зрабіце вусцілкі — лепш за ўсё з лямцу. Альбо можна ўзяць стары капялюш — кавалачкі велюру падыдуць занадта добра. Намажце іх клеем ды і закрапіце іх у валёнках. Засталося зусім трошкі: верхні край хатніх валёнак упрыгожце тасьмой, альбо каляровай тканінай. Унутры прапусціце шнур, на канцы прывяжыце кутасікі ў выглядзе той вышыўкі, што на пятцы. Ну вось і гатовая абнова. Хай ваша дзіця будзе здаровае і вясёлае. І скажа матуле «дзякуй»!

● ГЭТА КАРЫСНА



НА КУХНІ. Фота ЮРЫЯ ЗАХАРАВА.



Фото ЮРИЯ ЗАХАРОВА.

СКРОМНУЮ ГОСПОДЬ УВИДИТ

ГАЛИНА ГОЛОВАТАЯ, корреспондент «ДВ».

Сейчас модно ходить в церковь. Ведь иначе, чем модой, не объяснишь появление огромных толп людей в храмах во время служб. Особенно по религиозным праздникам. Да и не может быть такого, чтобы все разом вдруг стали истинно верующими, поняли и приняли Бога в сердце своем...

